# Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь
# узорны ансамбль спартыўна-бальнага танца «Элегія»
# Жлобінскага гарадскога цэнтра дзіцячай творчасці «Эўрыка»
# Гомельскай вобласці

Ансамбль спартыўна-бальнага танца «Элегія» створаны і дзейнічае ў Жлобінскім гарадскім цэнтры дзіцячай творчасці «Эўрыка» з 2002 года. Творчы калектыў узначальваеІлькова Ірына Алегаўна – член Беларускай федэрацыі танцавальнага спорту.

У ансамблі займаецца больш за 100 удзельнікаў у трох узроставых групах: малодшай, сярэдняй і старэйшай. Самы першы набор складае аснову старэйшай групы. Колькасны састаў ансамбля практычна не змяняецца, але ўвесь час абнаўляецца.

Работа калектыву накіравана як на стварэнне масавых нумароў, так і на малыя формы. Танцы маюць сюжэтную накіраванасць. У сваёй працы калектыў робіць акцэнт на масавае танцаванне. У канцэртнай дзейнасці выкарыстоўвае ўсе асноўныя танцы еўрапейскай і лацінаамерыканскай праграм (павольны вальс, фігурны вальс, венскі вальс, танга, квікстэп, ча-ча-ча, самба, румба, пасадобль, джайв і іншыя) робіць танцавальнае афармленне да песняў.

Пастаноўкі ажыццяўляюцца з улікам узроставых і тэхнічных здольнасцей удзельнікаў ансамбля, у ім займаюцца дзеці і дарослыя ва ўзросце ад 5 да 28 гадоў. Прымяняецца дыферэнцыяльны падыход да ўсіх удзельнікаў.

Калектыў вядзе актыўную дзейнасць, удзельнічае ў гарадскіх і абласных святах. Ансамбль спартыўна-бальнага танца «Элегія» знаходіцца ў беларускім альянсе танцавальнага спорту, а выхавальнікі калектыву з’яўляюцца пастаяннымі ўдзельнікамі конкурсаў па спартыўных танцах.

Адначасова з творчай, канцэртнай і рэпетыцыйнай дзейнасцю вядзецца сістэматычная выхаваўчая праца. У ансамблі ёсць цудоўныя традыцыі: провады выпускнікоў, святочныя салодкія сталы. Актыўны ўдзел у жыцці калектыву прымаюць бацькі. Яны дапамагаюць у арганізацыі выяздных канцэртных выступленняў, а таксама з’яўляюцца актыўнымі ўдзельнікамі ўсіх канцэртных і забаўляльных праграм.

Калектыў наведвае конкурсы па спартыўных (бальных) танцах, выставы, тэтральныя пастаноўкі, праглядае відэаматэрыялы, абмяркоўвае ўласны рэпертуар з кіраўніком. Вядуцца бяседы аб гісторыі ўзнікнення кожнага развучанага бальнага танца, яго музычнага характару. Усё гэта садзейнічае выпрацоўцы танцавальных рухаў, вывучэнню спецыфікі, прывівае добры мастацкі густ і спрыяе агульнаму развіццю дзяцей.

